**ЖАХЛІВАЯ ДЭМАГРАФІЯ**

У Івацэвіцкім раёне за 8 месяцаў года нарадзілася 433, а памерла 677 чалавек

2

**ПАМЯТАЕМ...**

Ці будзе ў Белаазёрску вуліца імя Ніны Мацяш?

3



**АВАРЫЙНЫ МОСТ**

непакоіць жыхароў вул. Будзённага ў г. Івацэвічы

14




Выдавец УП "Газета для вас"

Выдаецца са студзеня 1997 года на беларускай і рускай мовах

Перыядычнасць — адзін раз на тыдзень

# ГАЗЕТА ДЛЯ ВАС

ІВАЦЭВІЧЫ-БЯРОЗА-ПРУЖАНЫ-ДРАГІЧЫН

(Брэсцкая вобласць)

№ 39 (717) 25 верасня 2009 г., пятніца

Кошт свабодны (у розніцу)




# ВЯСКОВЕЦ ЖУРКО ВЕДАЕ, ЯК ВЫЙСЦІ З КРЫЗІСУ

## 1 кастрычніка — Дзень пажылых людзей

**Напярэдадні Дня пажылых людзей мне згадваецца казачка, пачутая калісьці ў дзяцінстве. У ёй распавядалася пра тое, што жыў нейкі народ, у сувязі з традыцыяй якога пажылых людзей выдалялі з грамадства і адносілі ў пэўнае месца паміраць. Не буду пераказваць гэтую казку, толькі адзначу, што адзін чалавек зразумеў, што так рабіць нельга, убачыўшы, што ягоны старэнькі бацька можа быць больш карысным грамадству сваёй мудрасцю і жыццёвым вопытам, чым некалькі маладых мужчын.**

Пра тое, якую ролю пажылыя людзі маюць у нашым грамадстве, паспрабуйце паразважаць самі, прааналізаваўшы тое, як сённяшнія пенсіянеры выжываюць на свае невялікія пенсіі і пры гэтым яшчэ ўмудраюцца матэрыяльна дапамагаць сваім дзецям...

Але, акрамя такой дапамогі, пажылыя людзі могуць яшчэ быць карыснымі і для ўсяго грамадства. Ёсць сярод іх унікальныя людзі, якія маюць прагу дапамогі не толькі сваім блізкім, але і ...цэлай краіне.

У гэтым мы пераканаліся, пагутарыўшы з жыхаром вёскі Дабрынева Івацэвіцкага раёна Аляксандрам Іосіфавічам Журко. Гэты мужчына вядомы ў вёсцы і па-за яе межамі сваёй актыўнай жыццёвай пазіцыяй і рознымі ідэямі, якія ён прапаноўвае па рэформе сельскай гаспадаркі.

**Павел ДАЙЛІД.**
**Івацэвіцкі раён.**

(Заканчэнне на 3-й стар.)



Павел ДАЙЛІД

Аляксандр Іосіфавіч Журко ведае, як трэба гаспадарыць на зямлі.




КНА
SALAMANDER
СЕРТИФИКАТ КАЧЕСТВА
НЕМЕЦКАЯ КОМПЛЕКТАЦИЯ
ИНДИВИДУАЛЬНЫЙ ПОДХОД
ПРОФЕССИОНАЛЬНАЯ КОНСУЛЬТАЦИЯ
ДВЕРИ ПВХ
ТЕПЛЫЕ БАЛКОНЫ
МОСКИТНЫЕ СЕТКИ
МТС. 8-029-723-47-33
VEL. 8-029-126-48-17
Свид.№ 200425557 от 18.08.2000 г. Ивацевичским РИК УНН 290344728
ОЩУЩЕНИЕ ДОМА-ОЩУЩЕНИЕ КОМФОРТА

Наш e-mail:
gdv@promedia.by



БЛОКИ газосиликатные
КИРПИЧ (печной и облицовочный)
ШИФЕР
ДОСТАВКА.
Форма оплаты
наличный
безналичный расчет
Тел. 8-029-772-62-77
8-029-525-63-05
УНН 290828408 Свид. № 0117703 от 25.01 2007 г. Ивацевичским РИК.

ОАО "ИВАЦЕВИЧДРЕВ"
объявляет процедуру запроса ценовых предложений на лесозаготовительные работы общим объёмом 726 куб. м. Предложения принимаются до 11.00 24.09. 2009 г.
Тел. 8-(01645) 2-32-82.

МеталлПрофиль
г. Береза, ул. Ленина 83 а, "Тихий дворик"
Тел. 8-029-723-98-27
8-029-727-79-89
ВСЕ ДЛЯ КРОВЛИ
- металлочерепица
- комплектующие
- водосточные системы
- утеплитель
Лиц. № 12080/0377135 до 29.06.2012 г. Березовским РИК.
Скидки. Замер. Доставка.

ЧПТУП "Манитоба"
Выполним
наружную
и внутреннюю отделку
в г. Ивацевичи
Благоустройство
Кровля.
(лицензия)
Термошуба.
Требуются на работу отделочники.
Тел. 8-029-791-86-93
8-(01645) 2-71-49
УНН 290485569

# ВЯСКОВЕЦ ЖУРКО ВЕДАЕ, ЯК ВЫЙСЦІ З КРЫЗІСУ

## 1 кастрычніка — Дзень пажылых людзей


Павел ДАЙЛІД.

**Гэты мост, рамонту якога ў 2004 годзе дабіваўся А. Журко, трэба рамантаваць ізноў.**

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Калі паміж Дабрыневам і Даманавам разваліўся мост праз раку, то менавіта Аляксандр Журко звяртаўся ў розныя інстанцыі, патрабуючы вырашэння праблемы. Дарэчы, як мы пераканаліся самі, той мост і цяпер трымаецца на "чэсным слове". Аляксандр Іосіфавіч кажа, што лепш было б сваі гэтага маста зрабіць бетоннымі, а не драўлянымі, тады і праблема знікла б.

Аляксандр Іосіфавіч — пенсіянер, як ён сам жартуе — аднагодак Айчыннай вайны (нарадзіўся 22 чэрвеня 1941 года). Ён лічыць, што эканамічны крызіс, пра які сёння вядзецца гэтак шмат размоў, насамрэч палягае ў галовах людзей. Паводле меркавання вяскоўца Журко, ніякага крызісу ў рэальнасці няма. Ёсць проста нежаданне і няўменне гаспадарыць на сваёй зямлі.

— А вы паглядзіце, крызісы на нашай зямлі не рэдкасць: Першая сусветная вайна, Другая сусветная вайна, калектывізацыя, якая вынішчыла гаспадара на зямлі, потым "халодная вайна" з капіталістычным светам. Усё гэта і прывяло да сённяшняга стану сельскую гаспадарку. Ды і сёння мы нерацыянальна карыстаемся нашай зямлёй, — падкрэсліў Аляксандр Іосіфавіч.

На прыкладзе Дабрынева Аляксандр Журко ўпэўнены, што ва ўсёй краіне можна больш карысці атрымліваць з зямлі:

— Я па два ўраджаі здымаю ў год на сваёй гаспадарцы. Не верыце? Прыязджайце, паглядзіце. Куды ні пазваню: на тэлебачанне, на гарачую лінію, розным органам улады — адхрышчваюцца ад мяне. Я ім увогуле прапаноўваю праграму па выхаду з фінансавага і эканамічнага крызісу, якая разлічана на тры этапы. У гэтай праграме могуць удзельнічаць усе, найперш беспрацоўныя. Што, няма работы? То прыязджайце ў вёску!

Аляксандр Іосіфавіч кажа, што і сам можа прапанаваць беспрацоўным шырокі спектр работы ў вёсцы. Распавядае, што можа навучыць, як здабыць грошы з зямлі.

— А грошы можна атрымліваць з усяго. У нас пад бокам шмат варыянтаў, як можна рэфармаваць, удасканальваць гаспадарку. Трэба збіраць сапрапель (глеістыя адклады ў прэсных вадаёмах, якія ўтрымліваюць вялікую колькасць арганічных рэчываў), гэта ж выдатнае ўгнаенне, якое дазволіць палепшыць ураджайнасць. Але ж мы гэтым не займаемся. Я прапаную таксама ставіць ветраныя млыны. Гэтак можна вырабляць электраэнергію, людзі будуць там малоць муку. Можна, нават, вырабляць і хвойную муку. Хвойная мука — вельмі карысны корм для жывёлы, які ўтрымлівае карацін, вітаміны, кальцый, фосфар, жалеза, марганец і іншыя мінералы. Асабліва добра хвойную муку дадаваць у корм жывёле ў зімовы і вясенні перыяд.

Аляксандр Іосіфавіч лічыць вельмі перспектыўным напрамкам распрацоўку і выраб біяпаліва.

— Я аж за галаву бяруся, калі бачу, як у нас ажыццяўляецца пераход на мясцовыя віды паліва: паказваюць па тэлевізары, як мужчына запіхвае ў топку трохметровую балванку... Гэта ж савецкі падыход да вырашэння паліўнай праблемы, — адзначыў Аляксандр Журко.

А яшчэ гэты пенсіянер з Дабрынева ўпэўнены, што трэба больш ставіць невялікіх гідраэлектрастанцый на тых рэках, дзе гэта магчыма. Ён лічыць, што мы недастаткова карыстаемся тымі прыроднымі рэсурсамі, якія маем.

Карацей, Аляксандр Іосіфавіч Журко аказаўся вельмі цікавым чалавекам з вельмі арыгінальнымі прапановамі і сваім бачаннем вырашэння розных праблем сучаснасці.

Ад'язджалі мы з Дабрынева з цвёрдай упэўненасцю, што ёсць яшчэ ў нашых вёсках людзі, якія здольныя не толькі блыху падкаваць, але нават і крызіс сусветны перамагчы.

**Павел ДАЙЛІД.**
**Івацэвіцкі раён.**

# Памятаем...



**Духоўнай каштоўнасцю Бярозаўскага краю была, ёсць і будзе паэтэса Ніна Мацяш. Праз яе паэзію лепш пазнаецца сэнс жыцця, яна выхоўвае любоў да роднай зямлі, мовы, спадчыны.**

20 верасня вядомай беларускай паэтэсе Ніне Язэпаўне Мацяш споўнілася б 66 гадоў. І каб не абарвалася яе жыццё ў снежні 2008 года, яна ў трэцюю нядзелю верасня прымала б кветкі і віншаванні. На жаль, не сустрэне яна больш сваіх сяброў. Не парадуе новымі вершамі... Шэраг жыхароў горада Белаазерска выступаюць з прапановай перайменавання вуліцы Леніна ў вуліцу імя Ніны Мацяш, а таксама адкрыцця музея ў яе кватэры і ўстаноўкі памятнай дошкі на доме, у якім яна жыла. Ідзе абмеркаванне гэтых прапаноў.

**Святлана БРАНКОВІЧ.**
**г. Бяроза.**

# Юбилей сыроделов

**В прошлом месяце известное в Беларуси предприятие "Березовский сыродельный комбинат" отметило свой юбилей — 65 лет со дня основания. Началась его история с августа 1944 года и лозунга "Все для фронта — все для победы!". Оборудование молочного завода в то время состояло из нескольких ручных сепараторов и ручной деревянной маслобойки. Ассортимент насчитывал всего лишь 3 вида: масло, молоко, творог.**

В связи с возраставшей потребностью населения в молоке и молочных продуктах в 1965—1967 годах был построен маслодельно-сыродельный завод мощностью 50 тонн переработки молока в смену, что позволило расширить ассортимент выпускаемой продукции. Покупателям предложили сыр "Российский". С этого времени проведено несколько реконструкций, увеличены мощности и ассортимент.



С июля 1994 года Березовский сыродельный комбинат является акционерным обществом открытого типа. Вместе с белорусами потребителями продукции комбината являются и россияне. За первое полугодие 2009 года предприятие выпустило молочной продукции более 15 тысяч 110 тонн. Ассортимент сыров насчитывает сегодня более 150 наименований.

**Светлана БРЕНКОВИЧ.**
**г. Береза.**

# Як жывецца пажылым людзям?

## Адказваюць жыхары і госці г. Івацэвічы



**ВАСІЛЬ ІВАНАВІЧ:** Мне добра жывецца, у нас з жонкай пенсія каля двух мільёнаў, дзеці ўладкаваныя, таму грэх на што-небудзь скардзіцца.



**СВЯТЛАНА ПАЎЛАЎНА:** Каму як жывецца. Я сем гадоў таму з Казахстана пераехала. У Беларусі лепш, чым там. Але пенсія ў мяне невялікая — 270 тысяч.



**РЫГОР РЫГОРАВІЧ:** Пенсія, канешне, малаватая, пражыць на яе цяжкавата, але не крыўдую, яшчэ і дзецям неяк стараемся дапамагчы. Галоўнае, каб мір быў.



**ГЕОРГІЙ СЯРГЕЕВІЧ:** Цэны растуць, пенсія застаецца на месцы. У крызіс трэба, каб начальнікі сабе зарплаты паменшылі, як гэта робяць у Прыбалтыцы.

Фатаграфавацца адмовілася

**АЛЕНА ЮСІФАЎНА:** Як мне, старому чалавеку, можа жыцца добра? Здароўя няма, пенсія малая, толькі на лекі і хапае, усё дарагое. І гэта — жыццё?



**ВАДЗІМ ПАЎЛАВІЧ:** З аднаго боку, жывецца ніяк нядрэнна, а з другога — так сабе. Галоўнае, што дзеці добра жывуць, а нам, старым, шмат і не трэба.

**У народ хадзіў Павел ДАЙЛІД (фота аўтара).**

Сяргей СІДОРСКІ:

# “БЕЛАРУСКАЯ АНТЫКРЫЗІСНАЯ ПРАГРАМА АПРАЎДАЛА СЯБЕ”

**Беларусь мае добрую антыкрызісную праграму, якая апраўдала сябе часам. Аб гэтым заявіў прэм’ер-міністр Сяргей Сідорскі 22 верасня ў Мінску на сустрэчы з кіраўнічым дырэктарам нямецкага банка АКА “Аўсфуркрэдыт-Гезэльшафт мбХ” Хансам-Йоргам Тотам. Сідорскі адзначыў, што сусветны фінансавы крызіс не абышоў бокам Беларусь. Антыкрызісную праграму прыйшлося карэктаваць. Цяпер, прадоўжыў кіраўнік урада, многія краіны заяўляюць аб выхадзе з рэцэсіі.**



“Але мы ставімся да гэтага пытання аб’ектыўна і робім усё, каб эканоміка Беларусі адчувала сябе больш упэўнена ў такіх умовах. Пацвярджэннем гэтаму з’яўляецца тое, што ВУП Беларусі сёлета знаходзіўся ў межах 100% узроўню 2008 года, гэта значыць фактычна мы ідзем па планцы мінулага года”, — сказаў прэм’ер-міністр.

Ён таксама падкрэсліў, што ўрад не здымае амбіцыйных задач, якія пастаўлены перад эканомікай. “Мы працягнем рэалізацыю інвестыцыйных і інавацыйных праграм на найбліжэйшыя тры-пяць гадоў. Пры агульным спадзе эканомік суседніх дзяржаў тэмп росту інвестыцый у Беларусі складае сёлета каля 117%”, — сказаў прэм’ер-міністр.

Гаворачы аб супрацоўніцтве з Германіяй, Сідорскі падкрэсліў, што гэтая краіна застанецца для Беларусі адным з вядучых гандлёва-эканамічных партнёраў. За сем месяцаў двухбаковы тавараабарот перавысіў 1 млрд. еўра. “У Беларусі нават ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу даволі паспяхова працуюць 352 прадпрыемствы з удзелам нямецкага капіталу”, — адзначыў кіраўнік урада.

Прэм’ер-міністр пацвердзіў гатоўнасць урада і надалей працаваць з банкам АКА. Ён таксама падзякаваў кіраўніцтву банка за “аб’ектыўную ацэнку дзеяннаў беларускага ўрада і работы эканомікі”. У сакавіку і верасні гэтага года АКА перагледзеў крэдытны партфель для Беларусі і павялічыў ліміты крэдытавання.

Паводле слоў Сідорскага, інвестыцыі сродкі былі накіраваны ў рэальную эканоміку. 21—22 верасня кіраўніцтва банка АКА азнаёмілася з паказчыкамі працы вядучых прадпрыемстваў Беларусі, якія атрымалі крэдытную падтрымку банка. Гэта прадпрыемствы машынабудавання, мікраэлектронікі, перапрацоўчай прамысловасці.

Сяргей Сідорскі заявіў аб сваёй зацікаўленасці азнаёміцца з высновамі нямецкіх партнёраў па выніках візіту. “Паколькі, заяўляючы аб адкрытасці і экспартаарыентаванасці нашай эканомікі, мы, натуральна, заўсёды гатовы працаваць над заўвагамі банкаў, якія даюць нам крэдыты”, — падкрэсліў прэм’ер-міністр.

**БелаПАН.**

# Малому бізнесу будзе лягчэй?

**Падрыхтаваны шэсць нарматыўна-прававых актаў, якія спрашчаюць дзейнасць суб’ектаў малога бізнесу. Частка з іх знаходзіцца на разглядзе ў Адміністрацыі прэзідэнта, частка — ва ўрадзе. Пра гэта на прэс-канферэнцыі 22 верасня ў Мінску паведаміў намеснік дырэктара дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі Аляксандр Тапілін.**

“Гэтыя ўказы таксама вырашаць праблемы дзейнасці суб’ектаў гаспадарання, якія тычацца мытнага афармлення і падатковай нагрузкі, што ў канчатковым выніку будзе ўплываць на кошт, — адзначыў Тапілін.

Паводле слоў спецыяліста, адзін з дакументаў будзе звязаны са зменай умоў падаткаабкладання з мэтай паніжэння падатковай нагрузкі на прадпрыемствы, у тым ліку ПУПы, якія будуць пастаўляць прадукцыю на экспарт. “Магчыма, будзе паніжана стаўка падатку ўдвая, можа быць выключаны з базы падаткаабкладання аб’ём выручкі ад рэалізацыі прадукцыі на экспарт”, — адзначыў Тапілін. Паводле яго слоў, пакуль гэта праект, і ў якім выглядзе ён будзе прыняты, ён не ведае.

Тапілін нагадаў, што ў адпаведнасці з распараджэннем прэм’ер-міністра створана рабочая група для аператыўнага аналізу сітуацыі, выпрацоўкі мер і аказання суб’ектам малога прадпрымальніцтва падтрымкі па рэалізацыі беларускіх тавараў на ўнутраным і знешнім рынках. Пасяджэнні гэтай групы праходзяць кожны тыдзень, і пра выпікі паведамляецца прэм’ер-міністру.

Як раней паведамлялася, 21 верасня ў Мінску на канферэнцыі прадпрымальнікаў “За права прадпрымаць!”, арганізаванай рэспубліканскім грамадскім аб’яднаннем “Перспектыва”, удзельнікі форуму заклікалі прэзідэнта Беларусі правесці найбліжэйшым часам першы агульнанацыянальны з’езд прадпрымальнікаў для абмеркавання праблем малога бізнесу. Як заявіў кіраўнік РГА “Перспектыва” Анатоль Шумчанка, правядзенне такога з’езда неабходна, каб прэзідэнт змог пагаварыць з прадпрымальнікамі “без пасрэднікаў, шчыра і адкрыта”.

**БелаПАН.**

# Доллары на “черный” день

**Кризис заметно изменил структуру денежных расходов и сбережений населения Беларуси.**

**Удельный вес расходов белорусов на покупку товаров и оплату услуг в первом полугодии существенно сократился, а вот откладывать на “черный” день стали больше. Это не очень хорошо для белорусского финансового рынка — ведь сбережения стремительными темпами растут исключительно в иностранной валюте, отмечает “Завтра твоей страны”.**



Удельный вес расходов на покупку товаров и оплату услуг сократился с 82,7% в январе-июне 2008 года до 76,8% в первом полугодии 2009 года. Повсеместная экономия на покупках отражается на показателях того же розничного оборота, который с начала года катастрофически сокращается. Если в январе 2009 года его темп роста к аналогичному периоду прошлого года составил 112,3% (в значительной мере, эта цифра — заслуга постновогоднего девальвационного ажиотажа), то в январе-июле он составил всего 102,7%.

По сравнению с январем-июнем 2008 года удельный вес расходов белорусов на сбережения вырос с 5,9 до 7,1%. В объемном показателе произошел рост в 1,5 раза. Главным образом, за счет депозитов. Причем сбережения растут только в иностранной валюте.

Средства населения в банках в рублях с начала года сократились на 693,9 млрд. рублей и составляли на 1 июля 7,04 трлн. рублей. А вот депозиты населения в иностранной валюте в рассматриваемом периоде выросли. Причем на весьма значимую цифру — на 4,06 трлн. рублей (в долларовом эквиваленте) или на 73,4%. На 1 июля вклады населения в валюте в белорусских банках составляли 9,59 трлн. рублей.

**tut.by**

# Узгаднілі прагнозны баланс

**Расія і Беларусь узгаднілі прагнозны баланс па ўзаемных пастаўках харчавання на 2010 год: ён застанецца на ўзроўні 2009 года з магчымасцю павелічэння. Аб гэтым 22 верасня ў Маскве заявіла міністр сельскай гаспадаркі Расіі Алена Скрыннік, паведамляе РІА Навасці.**

Прагнозны баланс попыту і прапановы Саюзнай дзяржавы вызначае аб’ёмы паставак па трох найважнейшых відах сельскагаспадарчай прадукцыі і харчавання: мяса і мясапрадукты, малако і малочныя прадукты, цукар-пясок. У 2010 годзе Расія плануе пастаўць у Беларусь 60 тыс. тон малака і малочнай прадукцыі (у пераліку на малако), мяса і мясапрадуктаў (у пераліку на мяса) — 3 тыс. тон, паставак цукру-пяску не прадугледжваецца.

У сваю чаргу Беларусь паставіць у РФ 2,8 млн. тон малака і малочнай прадукцыі, у тым ліку 12 тыс. тон сухога неразведзенага малака, 32 тыс. тон сухога абястлушчанага малака, 50 тыс. тон масла, 116 тыс. тон сыру і тварагу, 40 тыс. тон канцэнтраванага малака. Прадугледжваецца раўнамерная размеркаванне згаданых аб’ёмаў паставак малочнай прадукцыі па кварталах на працягу ўсяго наступнага года.

Мяса і мясапрадуктаў Беларусь паставіць у Расію ў наступным годзе 145 тыс. тон, у тым ліку 90 тыс. тон ялавічыны, 20 тыс. тон свініны, 8 тыс. тон мяса птушкі і 27 тыс. тон іншых відаў мясной прадукцыі. Аб’ём паставак цукру-пяску з Беларусі ў Расію плануецца на ўзроўні 150 тысяч тон (штоквартальна будзе пастаўляцца 37,5 тыс. тон).

**БелаПАН.**

# Рэалізацыя праектаў Усходняга партнёрства

**Рэалізацыя праектаў у рамках праграмы Еўрасаюза “Усходняе партнёрства” можа быць пачата ў 2010 годзе, паведаміў намеснік міністра замежных спраў Валерый Варанецкі, адказваючы 22 верасня на пытанні дэпутатаў падчас пасяджэння камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах і сувязях з СНД. Паводле слоў дыпламата, у праектах, якія падрыхтаваны Беларуссю, акцэнт робіцца на развіцці транзітнай інфраструктуры, стварэнні транспартных калідораў, а таксама пытаннях, звязаных з транспартным забеспячэннем і спрашчэннем мытных працэдур.**

Намеснік міністра паведаміў, што гэтыя праекты цяпер абмяркоўваюцца з Літвой, Латвіяй, Украінай, Польшчай, але пакуль Еўракамісія толькі выпрацоўвае механізмы іх зацвярджэння і магчымай рэалізацыі.

Варанецкі таксама адзначыў, што восенню гэтага года ў Стакгольме павінна адбыцца сустрэча старшынь камітэтаў па міжнародных справах парламентаў краін — удзельніц Усходняга партнёрства. Паводле яго слоў, на сустрэчы плануецца разгляд падыходаў да арганізацыі міжпарламенцкага ўзаемадзеяння паміж структурамі Еўрасаюза і дзяржавамі — удзельніцамі Усходняга партнёрства.

**БелаПАН.**

# Боевые самолеты будут садиться на “олимпийку”

**Посадку боевых самолетов на аэродромный участок дороги (АУД) в рамках оперативно-стратегических учений “Запад-2009” планируется выполнить 25 сентября.**

Об этом БелаПАН сообщили в командовании ВВС и войск ПВО Вооруженных сил Беларуси.

На участок автодороги Брест — Минск — границa РФ намечено посадить Су-25 206-й штурмовой авиационной базы (Лида) и МиГ-29 927-й истребительной авиабазы (Береза).

Впервые в истории Вооруженных сил Беларуси посадка на АУД была выполнена 14 апреля 2007 года двумя штурмовиками Су-25. 2 августа того же года впервые была совершена посадка на аэродромный участок дороги тяжелого истребителя Су-27.

**tut.by**

# Забойца асуджаны

**Увайшоў у сілу прыгавор Мінскага гарадскога суда ў дачыненні да 32-гадовага ўраджэнца Чойра (Манголія), грамадзяніна Беларусі, асуджанага на 25 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.**

Як паведамілі ў пракуратуры Мінска, якая праводзіла расследаванне, жыхар Бярозы (Брэсцкая вобласць) прызнаны вінаватым у згвалтаванні, насільных дзеяннях сексуальнага характару, разбоі і забойстве. 8 верасня 2005 года на вуліцы Кіжаватава ў Мінску ён напаў на 23-гадовую настаўніцу адной са сталічных школ. Злачынца згвалтаваў ахвяру, збіў яе, нанёс пры гэтым не менш як 18 удараў рукамі і нагамі, задушыў накінутай на шыю пятлёй і выкраў залатыя ўпрыгажэнні, мабільны тэлефон, асабістыя рэчы. У сталіцы мужчына знаходзіўся на заробках.

Раскрыць злачынства па “гарачых слядах” не ўдалося. Злачынца праціглы час знаходзіўся ў вышуку і быў затрыманы летась у Расіі, куды паехаў пасля забойства.

Устанавіць асобу забойцы ўдалося дзякуючы мабільнаму тэлефону дзяўчыны, які мужчына прадаў пасля ўчынення злачынства, і які быў выяўлены аператыўнікамі.

У якасці кампенсацыі маральнага ўрону маці забітай асуджаны павінен выплаціць 20 млн. рублёў.

**БелаПАН.**

# ЦІ МОЖНА ХРАМ ЗРУЙНАВАЦЬ?

## Праблемы захавання культавага дойлідства на Берасцейшчыне

**На працягу многіх стагоддзяў на Берасцейшчыне будаваліся цэрквы, касцёлы, сінагогі і іншыя культавыя пабудовы. Многія з іх папоўнілі скарбонку архітэктурных помнікаў Беларусі, але вялікая частка пабудоў да нашага часу не дайшла з-за войнаў і разбурэнняў. Трагічныя падзеі напаткалі культавую спадчыну і ў XX ст.**

Заходнія рэгіёны Беларусі, якія ў 1920-1930-я гады знаходзіліся ў складзе Польшчы, мінула разбуральная сіла савецкага “ваяўнічага атэізму”, але пасля II сусветнай вайны распачалася новая хваля барацьбы з рэлігіяй, якая ахапіла і заходнебеларускія землі.

Сярод шматлікіх накірункаў, форм і метадаў барацьбы з рэлігіяй асобнае месца займала закрыццё і руйнаванне культавых пабудоў: цэркваў, касцёлаў, капліц, сінагог, малітоўных дамоў.

У першую чаргу, ад гэтай палітыкі пацярпелі Праваслаўная і Каталіцкая цэрквы Берасцейшчыны. Для каталікоў вобласці пасляваенны час быў даволі складаным. Калі ў 1939 годзе на Берасцейшчыне жыло 143 575 чалавек каталіцкага веравызнання, 219 святароў, то пасля II сусветнай вайны засталіся дзеючымі на Берасцейшчыне (у сучасных межах) 43 касцёлы і 5 кляштароў. Першапачаткова мелася 32 святары, але пасля рэгістрацыі 1949 года па вобласці засталіся дзеючымі 18 касцёлаў, у якіх служылі толькі пяць ксяндзоў. Адразу пасля вызвалення Беларусі ў адносінах да каталіцкіх святароў распачалася хваля рэпрэсій, у выніку якіх без ксяндзоў засталіся 28 касцёлаў у Баранавіцкай вобласці, па 6 — у Брэсцкай і Пінскай абласцях (сёння тагачасныя Баранавіцкая і Пінская вобласці — у складзе Брэсцкай). Абсалютная большасць існуючых каталіцкіх касцёлаў і капліц не дзейнічала.

Вялікая частка будынкаў каталіцкай царквы была разбурана ў часы Вялікай Айчыннай вайны: касцёл у в. Альшова (Бярозаўскі раён), драўляны мужчынскі манастыр у Брэсце, капліцы ў в. Бакуны (Пружанскі раён), у г. Бяроза, в. Дубіца (Брэсцкі раён), в. Паляцічы (Кобрынскі раён). Гэтаксама ў час вайсковых дзеянняў былі спалены касцёлы ў в. Заосце (Жабінкаўскі раён), в. Збураж (Маларыцкі раён), будынак драўлянага гарнізоннага касцёлу ў Кобрыне і іншых мясцінах.

Вялікая частка касцёлаў і капліц была закінута, многія пуставалі. Пустуючым згадваецца старадаўні касцёл 1648 года ў в. Асавая, касцёл у в. Мерлін на Століншчыне, мураваная капліца ў в. Ракавіца Брэсцкага раёна. У 1946 годзе ў вельмі кепскім стане знаходзіўся касцёл з родавай спадчыны Нямцэвічаў у в. Скокі Брэсцкага раёна, што размяшчаўся на тэрыторыі сядзібы. Дзверы і вокны касцёла былі разламанымі, іканастас і рэлігійныя абразы — знішчанымі. Пасля расследаванняў раённай пракуратуры было ўстаноўлена, што ў Скоках стаяла вайсковая часць, якая і выкарыстала ўсё вышэйазначанае ў якасці паліва. Да нашага часу гэты касцёл не захаваўся.

Разбурэнні будынкаў каталіцкай царквы распачаліся адразу пасля вайны. У ліку першых былі зруйнаваны драўляная капліца ў в. Грыўда Іванаўскага раёна, мураваныя капліцы ў в. Дзяды Шарашоўскага раёна, в. Мінковічы Высокаўскага раёна і інш. Мураваны касцёл у Івацэвічах быў зруйнаваны ў 1949 годзе, да гэтага ён быў перабудаваны і абсталяваны пад пякарню ў лагеры ваеннапалонных пры будаўнічым раёне №10 НКУС.

Напачатку 1960 гадоў былі разбураны касцёлы ў г. Бяроза, г. Ганцавічы. У в. Дзераўная Баранавіцкага раёна касцёл быў разламаны, яго матэрыял быў выкарыстаны пры будаўніцтве прыбудовы да школы (звесткі пач. 1960-х гг.). Пасля закрыцця ў 1962 г. быў зруйнаваны касцёл у в. Макееўшчына Ляхавіцкага раёна, вядомы з 1916 года.

Цяжкае становішча мела Праваслаўная царква Берасцейшчыны. Шмат царкоўных будынкаў было разбурана ў час II сусветнай вайны, асабліва ў партызанскіх зонах. Пасля вызвалення Беларусі Праваслаўная царква, у адрозненне ад Каталіцкага касцёлу, атрымала некаторую палёгку. Савецкая дзяржава першапачаткова не пярэчыла адкрыццю і будаўніцтву цэркваў. Закрыццё цэркваў адбывалася толькі пры стварэнні памежнай зоны па р. Буг і новай мяжы паміж ПНР і СССР, усталяванай ў 1945 годзе. Напрыклад, у в. Крынкі Высокаўскага раёна царква была закрыта ў 1947 годзе, пазней разбурана. Праз год былі зачынены цэрквы ў в. Харсы і в. Дамачава.

У 1952 годзе ў в. Сяхновічы была разбурана званіца адкрытага тыпу: “Навес для колоколов (отдельно от церкви) на деревянных столбах признан аварийным и по ветхости подлежит разборке” (паводле акта ад 25.10.1952 г.).

У 1954 годзе ўзнікла праблема адносна пабудовы царквы ў в. Вялікая Сваротва Баранавіцкага раёна. Настаяцель прасіў дазволу на яе аднаўленне. Царква, пабудаваная ў XIX стагоддзі, была спалена ў 1943 годзе. 28 красавіка 1954 года часовае памяшканне малітоўнага дома таксама было спалена, і прыход быў зачынены. Вернікам не было дазволена адбудоўваць царкву за ўласны кошт. Савецкая ўлада ў асобе чыноўнікаў настойліва адмаўляла ў адкрыцці новых прыходаў, а ў наступныя гады рознымі спосабамі імкнулася ліквідаваць ужо існуючыя.


radzima.org

**Вучні школы каля царквы Св. Мікалая ў в. Лактышы Ганцавіцкага р-на. Пабудавана ў 1792 г., перабуд. у 1864 г. Знішчана ў 1950-х гг. Здымак 1950-х гг.**


radzima.org

**Вялікая сінагога ў Пінску перад знішчэннем ў 1960-х гг. Пабудавана ў 1506 г.**

У пачатку 1957 года была зруйнавана царква ў в. Альшова, якая не дзейнічала з 1934 года. У гэтым жа годзе праўленне калгаса ў в. Шэйпічы Пружанскага раёна, па ўзгадненні з упаўнаважаным па справах РПЦ і іншымі органамі, зруйнавала вясковую капліцу (былая ўніяцкая, XVIII ст.).

Актывізацыя барацьбы з праваслаўнай царквой пачалася ў 1960 годзе, калі распачалася мэтанакіраваная палітыка ціску на дзейнасць цэркваў. Праца органаў улады ў гэты час была непасрэдна скіравана на “скарачэнне сеткі цэркваў”. За адзін толькі 1960 год на Берасцейшчыне было закрыта 56 цэркваў. Паводле звестак на сакавік 1965 года, было зачынена 165 праваслаўных цэркваў.

Пасля закрыцця шматлікія цэрквы руйнаваліся. Напрыклад, на Століншчыне прапанавалася знесці цэрквы ў Століне (могілкавая царква), вёсках Відзібор, Юнішча, Цмень, Калоднае, Варані, Аўсемірава, Дубай-Зарэчны. Будынак царквы ў в. Храпуны да гэтага часу ўжо быў спалены.

Асаблівай актыўнасцю пры разбурэнні цэркваў вылучыліся кіраўнікі Камянецкага, Столінскага і Маларыцкага раёнаў.

23 лютага 1965 года абласныя ўпаўнаважаныя па справах РПЦ і рэлігійных культаў Іваноў і Стральчонак просяць выканаўчыя ўлады вырашыць пытанне адносна зачыненых памяшканняў, 66% з якіх у гэты час не выкарыстоўваліся. У сувязі з гэтым савецкія чыноўнікі прыходзяць да наступнай высновы: “...прыстасаванне культавых пабудоў пад складскія памяшканні па-сутнасці не вырашаюць пытання аб іх выкарыстанні, так як пры гэтым захоўваецца знешні царкоўны выгляд... Прыстасаванне зачыненых культавых памяшканняў пад грамадскія патрэбы на месцы прадстаўляе цяжкасці. Усе зачыненыя цэрквы і касцёлы маюць спецыфічную архітэктуру. Напрошваецца вывад аб зносе большасці памяшканняў. Зачыненыя праваслаўныя цэрквы ў


radzima.org

**Касцёл Маці Божай Чэнстахоўскай у в. Богдзюкі (Жабінкаўскі р-н). Разабраны ў 1958 г. Матэрыял пайшоў на адбудову сельскага клуба.**

сельскай мясцовасці ў большасці драўляныя. Пры іх зносе матэрыял можа быць выкарыстаны пад школы, фельчарска-акушэрскія пункты і для іншых грамадскіх патрэб. Патрэбна вырашыць пытанне аб выкарыстанні або зносе 143 культавых памяшканняў, з іх 33 знаходзяцца на могілках. Пры зносе ці рэканструкцыі не выключаецца магчымасць супрацьдзеяння ў той ці іншай форме з боку вернікаў. Гэта неабходна ўлічваць і заўчасна праводзіць некаторую працу”.

Праз некаторы час з’яўляецца рашэнне выканаўчага камітэта Брэсцкага абласнога савета дэпутатаў “Аб выкарыстанні зачыненых памяшканняў рэлігійных культаў па вобласці”. Згодна з гэтым рашэннем, выканкамы раённых і гарадскіх саветаў працоўных дэпутатаў абавязалі ў месячны тэрмін разгледзець асобна кожнае культавае памяшканне (сюды ўключаны цэрквы, касцёлы, сінагогі і інш.) і пытанні яго выкарыстання на месцы або зноса, вызначыць, для якіх мэтаў можна выкарыстоўваць тое або іншае памяшканне пасля яго разборкі. Да 1 верасня 1965 года загадвалася скончыць працу па прыстасаванні або зносе зачыненых культавых пабудоў і праінфармаваць аб праведзенай працы аблвыканкам, працу “арганізаваць прадумана, каб не дапусціць непажаданых выступаў вернікаў”. Дакумент быў падпісаны старшыней Брэсцкага аблвыканкама К. Мацюшэўскім і сакратаром А. Ярашэнка. Дакладных звестак, наколькі поўнасцю быў рэалізаваны гэты праект, няма, але можна дапусціць, што такую пастаноўку пытання мясцовыя ўлады праігнараваць не змаглі.


radzima.org

**Касцёл Узвышэння Св. Крыжа ў Івацэвічах. Пабудаваны ў 1750-х гг. Зруйнаваны ў 1949 г., да гэтага быў пераабсталяваны пад пякарню ў лагеры ваеннапалонных пры будаўнічым раёне №10 НКУС. Здымак Юзафа Шыманьчыка, 1927 г.**

Разбурэнні культавых пабудоў закранулі і іудзейскія абшчыны. У адрозненне ад хрысціян, іудзеям не вярталі сінагогі (за выключэннем некалькіх выпадкаў). У атэістычным СССР да іх ставіліся насцярожана. Паводле вышэй згаданага дакумента, (1965 г.), распачаліся пераабсталяванні сінагог пад розныя гаспадарчыя патрэбы. Пад Дамы культуры сінагогі былі пераабсталяваныя ў в. Моўчадзь, Новая Мыш, Гарадзішча Баранавіцкага раёна, у г. Камянец (драўляная сінагога), у в. Пагост-Загародскі. Пад склад выкарыстоўваліся сінагогі ў г. Высокае (драўляная манументальная сінагога) і ў г. Ружаны. У Кобрыне сінагога была прыстасавана пад піваварню. Сінагогі ў Брэсце і Пінску былі ператвораны ў спортзалы. Некаторыя сінагогі былі перароблены ў кінатэатры, нарыклад, у Антопалі.

Горшы лёс напаткаў сінагогу ў Іванаве, яна была разбурана напачатку 1960-х гадоў. У гэты час у Пінску пры рэканструкцыі галоўнай плошчы была зруйнавана сінагога, вядомая з XVI ст. Гаспадарчае выкарыстанне сінагог прывяло да таго, што частка з іх да сённяшняга часу не дайшла, большасць знаходзіцца ў дрэнным стане.

Сёння, аналізуючы і ацэньваючы праявы палітыкі савецкай улады ў адносінах да культавага дойлідства на Берасцейшчыне, можна канстатаваць сумныя наступствы гэтага цемрашальства. Вялікая колькасць помнікаў даўніны, драўляных цэркваў, касцёлаў, старадаўніх капліц, якія з’яўляліся неад’емнай часткай культурна-гістарычнай спадчыны нашага народа, выканала ролю закладнікаў барацьбы бальшавікоў з рэлігіяй.

**Аляксандр СТРОКАЧ.**
**г. Брэст.**

# АВАРЫЙНЫ МОСТ

## непакоіць жыхароў вуліцы Будзённага ў г. Івацэвічы

**У рэдакцыю патэлефанаваў жыхар вуліцы імя Будзённага г. Івацэвічы Юрый Вітальевіч Шапаваленка, які распавёў аб праблеме, якая турбуе мясцовых жыхароў.**

Справа ў тым, што пешаходны масток праз канаву, які ўжо каля 40 гадоў існаваў на вуліцы Будзённага, абваліўся і ўжо на працягу амаль месяца ўяўляе небяспеку. Бо акрамя таго, што людзям проста нязручна прайсці па гэтай вуліцы, тут існуе і сур'ёзная рызыка для жыцця.

Калі збочваць пешшу ці ехаць на веласіпедзе на вуліцу Будзённага з боку Дэпутацкай, то можна не заўважыць, што палова маста абрушылася. Як расказаў нам пажылы мужчына, дом якога размешчаны каля гэтага маста, дрэнныя выпадкі тут ужо адбываліся. Кажа, што неяк, выйшаўшы з двара, ўбачыў, як нейкі чалавек ехаў на веласіпедзе і, нягледзячы нават на ягоны папераджальны крык аб небяспецы, не паспеў зрэагаваць і з веласіпедам упаў у яму, створаную разваленым мастом.

— Да бяды нядоўга, — распавёў нам Юрый Вітальевіч, — калі такое здарэцца ўдзень, то што казаць пра тое, што ў прыцемках які-небудзь веласіпедыст можа не заўважыць зламанага маста. Гэта ж трагедыя можа здарыцца! Тое, што нязручна на работу людзям хадзіць, гэта паўбяды, але каб горшага чаго не нарабілася.

Яшчэ Юрый Вітальевіч паскардзіўся на тое, што вуліца Будзённага ўвогуле нейкая схаваная ад добраўпарадкавання.

— Перад дажынкамі калісьці каналы чысцілі, а цяпер яны ўжо пазарасталі. А вуліца ідзе пад ухілам, і ў дажджы яе моцна размывае. Мы ж тут амаль у цэнтры горада, няўжо нельга ў нас асфальт пакласці? Вуліца невялікая, асфальту не так і шмат трэба, — паскардзіўся наш чытач.

З мэтай атрымаць тлумачэнні па названай праблеме мы патэлефанавалі ў ДУВП "Івацэвіцкая ЖКГ", дзе намеснік генеральнага дырэктара нам адказаў, што па тэлефоне ён не будзе даваць ніякіх каментарыяў. Ён дадаў, што наш пісьмовы запыт разгледзяць і адкажуць афіцыйным лістом. Міжволі падумалася, што, мусіць, упаўшы масток з'яўляецца нейкім важным стратэгічным аб'ектам, стан якога па тэлефоне абмяркоўваць немагчыма нават тады, калі гэтага просяць людзі.



Павел ДАЙЛІД.

Гэтаму пешаходу пашчасцілася перабрацца праз масток...

Рэдакцыя адправіла пісьмовы запыт аб праблеме абваленага маста ў ДУВП "Івацэвіцкая ЖКГ". Вядома, што перапіска займе працяглы час. Мы просім прабачэння ў чытачоў "Газеты для вас" за такую вось "аператыўнасць", але як толькі атрымаем адказ, то апублікуем яго. Спадзяёмся ўсё ж, што чыноўнікі ў нас існуюць для народа, а не наадварот.

Некалі, у савецкія часы, вуліцы нашых гарадоў атрымлівалі назвы ў гонар вялікіх камуністычных правадыроў і дзеячоў. Зразумела, што імя Леніна (а ў пэўны час — Сталіна) маглі насіць толькі самыя буйныя, цэнтральныя вуліцы. Меншыя прэтэндавалі на імя Маркса або Энгельса, а яшчэ меншыя — якога небудзь Кірава або, як у нашым выпадку — Будзённага. Але нават Кіраў з Будзённым былі вельмі паважанымі ў савецкім грамадстве. Сёння ж прыйшлі часы капіталізму (або рынкавага сацыялізму), а вуліцы нашых гарадоў працягваюць насіць камуністычныя імёны. Вось толькі павага да гэтых імёнаў, напэўна, ужо знікае, калі вуліца Будзённага можа быць занядбанай...

**Павел ДАЙЛІД.**
**г. Івацэвічы.**

# День без автомобиля

**Второй год подряд 22 сентября Министерство транспорта и коммуникаций инициировало проведение в Беларуси масштабной акции "День без автомобиля". Организаторы мероприятия, в числе которых Министерство природных ресурсов и охраны окружающей среды, предложили автомобилистам временно отказаться от поездки на личном транспорте и воспользоваться услугами общественного, что непременно скажется на улучшении экологической обстановки во всей республике.**



Во время акции работники Березовского городского центра гигиены и эпидемиологии проверяли уровень загрязнения воздуха, сделали сравнительный анализ количества личного автотранспорта накануне и в день проведения акции, а также числа пассажиров, использующих для поездок общественный транспорт.

Акция "День без автомобиля" призвана напомнить о негативном влиянии автомобилей на окружающую среду и подтолкнуть людей к идее о необходимости пользоваться альтернативными автомобилю средствами передвижения. Впервые такая акция прошла во французском городе Ла Рошель в 1997 году, а год спустя эту инициативу подхватила вся страна. В 1999 году к Франции подключились Италия и Швейцария, после чего идея проведения Международного дня без автомобиля распространилась на всю Европу. В 2008 году в этой акции участвовали 1.353 города в 37 странах Европы и Канаде.

Данная акция должна способствовать снижению уровня вредного воздействия транспорта на окружающую среду, а также улучшению условий дорожного движения и здоровому образу жизни людей. В проведенный в прошлом 2008 году День без автомобиля в Беларуси объем выбросов загрязняющих веществ автотранспорта в атмосферу сократился на 15%.

По данным Минприроды, в прошлом году наибольшее количество водителей присоединилось к акции в Минске. Здесь 22 сентября продали автомобильного топлива примерно на 4% меньше обычного. Транспортные потоки на дорогах столицы были короче, снизился уровень аварийности. При этом пассажиропоток в столице вырос примерно на 10%.

**Светлана БРЕНКОВИЧ.**
**г. Береза.**

# Расія адродзіцца,

## але вялікай не стане

**У брэсцкім выдавецтве "Альтэрнатыва" выйшла кніга прафесара кафедры паліталогіі і сацыялогіі Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Пушкіна Івана Катляра "Расія XXI стагоддзя: грамадска-палітычны працэс у ацэнках беларускага палітолага".**

У 264-старонкавым навукова-папулярным выданні аўтар аналізуе праблемы становлення сучаснай Расіі, яе стану ў першым дзесяцігоддзі XXI стагоддзя і перспектывы развіцця краіны, пытанні ўзаемаадносін Расіі з Беларуссю і сусветнай супольнасцю.

У прадмове да кнігі аўтар адзначае, што яго зварот да аналізу мінулага, цяперашняга і будучага Расіі не выпадковы, паколькі гэта краіна іграе ключавую ролю ў энергетычнай бяспецы сучаснага свету. Расія займае 13% тэрыторыі планеты, тут жыве менш за 3% насельніцтва свету, але сканцэнтравана звыш за 34% сусветных разведаных запасаў прыроднага газу і каля 13% — нафты. Краіна займае першае месца ў свеце па міжнародным гандлі прыродным газам і другое месца па экспарце нафты і нафтапрадуктаў, гаворыцца ў прадмове.

У заключэнні да выдання Катляр падкрэслівае, што ў Расіі дзейнічае механізм тармажэння працэсу яе пераўтварэння ў вялікую краіну. Сярод элементаў гэтай сістэмы вучоны называе ўладу алігархаў; саюз алігархаў, вышэйшага палітычнага кіраўніцтва краіны і вышэйшага духавенства; усеўладдзе чыноўнікаў;ператварэнне ў "культурную пустыню" большай часткі тэрыторыі краіны; непавагу да інтэлектуальнай працы, сістэмы адукацыі і навукі; амаральнасць грамадства; антыграмадзянскую пазіцыю СМІ; дэградацыю вёскі і моладзі; адсутнасць у Расіі масавага руху народа ў сваю абарону; малую колькасць насельніцтва, а таксама працяг практыкі суб'ектыўных няправільных ацэнак сітуацыі.

Як лічыць вучоны, у сувязі з тым, што гэты механізм тармажэння наўрад ці зменіцца ў бліжэйшае дзесяцігоддзе, да 2020 года Расія адродзіцца (у параўнанні з краінай дваццацігадовай даўніны), але вялікай не стане.

**Марат ГАРАВЫ,**
**БелаПАН.**

# Вайна ў гісторыі маёй сям'і

**У жыцці чалавека бываюць такія моманты, якія змяняюць увесь далейшы лёс. Гэтыя моманты могуць змяніць жыццёвы шлях так, як мы марым, ці наадварот — назаўсёды пакінуць цяжкія ўспаміны. Пакаленню нашых дзядоў давялося перажыць страшэнную вайну, якая змяніла лёсы і планы многіх з іх. Так адбылося і з маёй бабуляй, Любоўю Варфаламееўнай Шука.**

Нарадзілася яна ў вёсцы Малое Бушкава на Магілёўшчыне ў лістападзе 1935 года. Бацькі, Нікіценка Хрысціна Міхайлаўна і Варфаламей Васільевіч, працавалі ў калгасе. Усяго ў сям'і было сямёра дзяцей, але трое памерлі немаўлятамі. Мая бабуля расла з сястрой Агафіяй, братамі Фёдарам і Іванам. Вельмі цяжкія выпрабаванні прынесла Вялікая Айчынная вайна гэтай працавітай сям'і. Бацьку адразу заклікалі абараняць родную зямлю, а маці з дзецьмі засталіся на акупіраванай гітлераўцамі тэрыторыі.

Бабуля не можа без слёз успамінаць увесь той жуд дзяцінства. Дзяцінства, якога ў яе не было.

Нямецкія салдаты, якія акупіравалі родную вёску, занялі частку дамоў аднавяскоўцаў. Вераснёўскай ноччу 1943 года ў адным з такіх дамоў з печы выпаў маленькі вугольчык. Падлога ў хаце была выслана саломай, таму адразу ўспыхнула полымя. Фашысты палічылі, што дом падпалілі партызаны ці вяскоўцы. Помста з боку ворага была жорсткай: вёску поўнасцю спалілі. У тым жа вясні 1943 года людзей прымусова вывезлі на працу ў Германію. Сярод іх была і сям'я маёй бабулі. Без вады і ежы ў таварных цягніках іх везлі ў чужую краіну. Маленькі брацік Іван, які нарадзіўся ў 1940 годзе, не вытрымаў выпрабаванняў і памёр у дарозе. Тыя, каму пашчасціла выжыць, былі дастаўлены ў Штутгарт. Сям'я бабулі разам з астатнімі аднавяскоўцамі апынулася ў лагеры "Юдонфрытгоф", які размясціўся на ўскрайку горада ў былой яўрэйскай сінагозе. Дарослыя працавалі па гаспадарцы, выконвалі цяжкую фізічную работу. Бабуля памятае, што невыносным было пачуццё голаду. Дзеці пухлі ад недахопу ежы, многія паміралі. Маці кожны дзень павінна была хадзіць на работу. Фізічныя сілы пакідалі яе, але той адзіны кавалак хлеба яна дзяліла між сваіх дзяцей.

22 красавіка 1945 г. лагер вызвалілі амерыканскія войскі. У той час усе вызваленыя ад нямецкага палону павінны былі прайсці



Яніна ШУКА.

Л. В. Шука.

"фільтрацыю" органамі дзяржаўнай бяспекі СССР. У сувязі з гэтым сям'я маёй бабулі змагла вярнуцца на радзіму толькі ў кастрычніку 1945 года. Аднак роднай вёскі больш не было.

У той час у родных мясціны вярталіся многія жыхары, у асноўным, жанчыны і дзеці. Мужчын было мала, многія загінулі на фронце. У першыя пасляваенныя гады для жылля былі прыстасаваны зямлянкі. Бацькі, Варфаламея Васільевіча, не было, і маці ледзьве спраўлялася, каб выжыць у тыя цяжкія галодныя гады. Бацька вярнуўся дамоў толькі праз пяць гадоў пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны. У адным з баёў ён трапіў у палон, быў вызвалены савецкімі войскамі. Той, хто быў вызвалены з палону, часта трапляў ужо ў савецкія лагеры ў Сібір. Так здарылася і з татам маёй бабулі. Адпрацаваўшы каля пяці год, бацька вярнуўся на сваю маленькую радзіму. Родныя ўжо і не марылі яго ўбачыць жывым. З мужчынскай сілай сям'я здолела пабудаваць невялічкую хатку.

Самы яскравы ўспамін бабулі таго часу — гэта падарунак, які яна атрымала за выступленне, што ладзілася ў райцэнтры. Бабуля расказвала вершы і спявала песні. Падарункам былі аладкі, выпечаныя з пшанічнай мукі. Такі пачастунак у той час быў рэдкасцю. Яна прынесла дамоў у хустцы некалькі аладак і пачаставала родных. Пах таго падарунка і задавальненне бабуля памятае ўсё жыццё.

Пазіраю на роднага чалавека і так хочацца паўтараць: "Мілая мая бабуля! Вайна забрала ў цябе дзяцінства, але мы, твае ўнукі, здзейснім усё тое, аб чым ты марыла і што абставіны не дазволілі табе зрабіць. Вайны больш не будзе!"

**Яніна ШУКА,**
**вучаніца 10 класа**
**СШ №3**
**г. Пружаны.**

# Сводка погоды (25.09.2009 г. — 01.10.2009 г.)

| от www.meteo.by | 25 | 25 | 26 | 26 | 27 | 27 | 28 | 28 | 29 | 29 | 30 | 30 | 1 | 1 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | ночь | день | ночь | день | ночь | день | ночь | день | ночь | день | ночь | день | ночь | день |
| Температура, С | +9 | +15 | +9 | +16 | +11 | +18 | +10 | +19 | +11 | +19 | +10 | +13 | +9 | +14 |
| Тенденция давления | 744 | 745 | 748 | 750 | 750 | 750 | 747 | 743 | 739 | 739 | 736 | 740 | 741 | 740 |

# Анекдоты

Радостью в России принято делиться сразу со всем спящим кварталом.

У стен ЗАГСа:
— Милый, я должна тебе признаться: я не умею готовить!
— Не беспокойся, дорогая, тебе не придется готовить, так как я не умею зарабатывать...

На экзамене в мединституте: "Какова вероятность подхватить одновременно птичий грипп и свиной?"
Студент: "Нуль".
Экзаменатор: "Почему?"
Студент: "Гусь свинье не товарищ".

Наибольшим спросом среди всей печатной продукции до сих пор пользуются деньги.

Муж и жена поругались и не разговаривают. Через некоторое время она решила помириться и говорит:
— Ладно, ладно, не дуйся, мы с тобой оба виноваты. Немного помолчала и добавила:
— Особенно ты!

Создать мир могут единицы, уничтожить мир могут десятки, изменить мир могут сотни, думать, что они принадлежат к первым трем категориям, могут миллиарды.

Совесть — это тихий голос, напоминающий, что за тобой могут подсматривать!

Самая плохая привычка у женщин — чуть что, сразу замуж.
Мужчины, учитесь хорошо заниматься сексом, и сэкономите на средствах от головной боли для жены.

Директор — новому сотруднику:
— Понимаете, на испытательном сроке я испытываю вас, а не вы мое терпение!

Из школьного сочинения: "Динозавры вымерли, так как чувствовали, что скоро появятся люди".

Хакера Иванова за написание и распространение вредоносных программ, а также воровство персональных данных суд приговорил к каторжным работам в магаданском филиале Лаборатории Касперского.

Людям по природе свойственно ошибаться, а иначе мы бы и не размножались.

По просьбе ГАИ белорусскими учеными разработан новый радар — он сразу показывает сумму, которую должен заплатить водитель, чтобы от него отстал инспектор...

# ГОРОСКОП
**28.09—04.10**

**ОВЕН (21.3—20.4)**
Вы более обычного стремитесь к конфликту и готовы ввязаться в драку. Выход из такой ситуации лучше искать путем переговоров. Если представить конструктивные доказательства собственной правоты и грамотно расставить акценты, то все неприятности можно обратить себе на благо.

**ТЕЛЕЦ (21.4—20.5)**
Есть шанс подняться по служебной лестнице, перепрыгнув за один раз даже не одну, а несколько ступенек. Есть шанс набить свой кошелек до отказа. После достижения финансового успеха проблемы в личных и семейных отношениях разрешатся с легкостью и изяществом.

**БЛИЗНЕЦЫ (21.5—21.6)**
Вы на этой неделе царствуете на вечеринках и прочих раутах. Если у кого-то проблемы с рекламной кампанией, то следует срочно нанять Близнеца, и все сразу устроится. Кстати говоря, так же легко устроится и личная жизнь, если, конечно, отказаться от веры в существование воздушных замков и прекрасных принцев в реальной жизни.

**РАК (22.6—22.7)**
Родной дом и его обитатели день ото дня требуют все больше заботы, внимания и, главное, капиталовложений. Внимание потребуют старшие члены семьи. Не питайте излишних иллюзий о возможном материальном вознаграждении за труды — размер потенциального наследства способен скорее разочаровать.

**ЛЕВ (23.7—23.8)**
Вся неделя пройдет в переговорах и следующих за ними деловых ужинах. Вы многое узнаете, обретете немало нужных знакомств. Среди полученных сведений окажется много непроверенных и недостоверных, поэтому готовьтесь к борьбе с информационным потоком.

**ДЕВА (24.8—23.9)**
Сейчас есть и силы, и деньги для того, чтобы распутать клубки сложных отношений, избавиться от всего, что мешает и в доме, и на работе. Обследование собственного здоровья тоже способно дать объективные результаты. Впрочем, деньги сейчас приходят к вам легко, а значит, и расставаться с ними следует без грусти.

**ВЕСЫ (24.9—23.10)**
Энергии и способности произвести впечатление у вас хоть отбавляй. Доставайте из закромов памяти все случившиеся с вами за последние полгода неурядицы и недомолвки и попробуйте воспринять их как маленькую прореху на одежде. Дела сердечные упорядочатся сами собой, даже усилий на это тратить не придется.

**СКОРПИОН (24.10—22.11)**
Настроение недели — интрига. Дается возможность проявить себя мастерами в этой области и сплести сети для искусной западни практически из ничего. Сами они тоже могут попасться в эту ловушку, но и такой поворот событий лишь добавляет адреналина в повседневную жизнь.

**СТРЕЛЕЦ (23.11—21.12)**
Положительные эмоции в жизнь принесет ощущение дружеского локтя. Командная игра имеет свои плюсы, но зацикливаться на ощущении себя неотъемлемой частью дружного коллектива не стоит. Помните, каждый преследует свои собственные интересы.

**КОЗЕРОГ (22.12 — 20.1)**
Наступившая осень принесет повышение по службе, но, увы, красивое название должности не обязательно сопровождается ростом материального достатка. Если финансовые трудности вас не пугают, то милости просим дальше — вверх по служебной лестнице.

**ВОДОЛЕЙ (21.1 — 19.2)**
Вполне удачный период, в особенности если вы выступите в роли наставника или советчика. Жаль только, что никаких реальных достижений, в особенности способствующих пополнению банковского счета, не ожидается. Остается лишь надеяться, что сделанное добро всегда отзывается ответным жестом.

**РЫБЫ (20.2—20.3)**
Можете попробовать себя на поприще азартных игр. Ценные подарки и неожиданные денежные поступления весьма вероятны. Степень серьезности отношений с дарителем оценивать будете сами и только сами. Впрочем, приятные эмоции и хорошие воспоминания гарантируются на сто процентов.

## ПРАВИЛА ПОДАЧИ ЧАСТНЫХ ОБЪЯВЛЕНИЙ ПО КУПОНУ

- Купон предназначен для бесплатного частного объявления (детям (продаю и куплю), сдам, утеряно, даром, стол находок, ищу работу) или поздравления без стихотворного куплета и фотографии.
- За каждый стихотворный куплет к поздравлению нужно перечислить **1000 рублей на счет 3012000001022 ф-л 111 АСБ "Беларусбанк", г. Ивацевичи, код 150501623, УНН 200515456** и выслать квитанцию вместе с купоном и текстом на адрес отдела рекламы редакции: **г. Ивацевичи, ул. Ленина, 8а.** Эти же реквизиты используются для оплаты объявлений в платные рубрики.
- Один купон должен содержать **ОДНО** объявление в **ОДНУ** рубрику.
- При заполнении каждая буква или цифра пишется в одну клеточку, между словами пропускается по одной клетке.
- К объявлению о продаже недвижимости прикладывается копия техпаспорта дома, квартиры или гаража.
- Купоны без фамилии и адреса рекламодателя, а также коммерческого характера не печатаются.

**ПЛАТНЫЕ РУБРИКИ** (одно слово — 400 руб.)

**продается** (недвижимость; авто-мото-вело, запчасти, сельхозмашины; бытовая и оргтехника; мебель; разное)
**куплю, сниму, меняю, требуется;**

**минимальная стоимость 2800 руб.;**
**оплата производится и в отделе рекламы редакции: г. Ивацевичи, ул. Ленина, 8А.**

## ГАЗЕТА ДЛЯ ВАС — КУПОН

**для частного объявления в бесплатные рубрики**

**ДЕЙСТВИТЕЛЕН с 25.09.09г. по 01.10.09г.**

**Текст писать разборчиво, печатными буквами**

Фамилия, имя и адрес
(сведения не печатаются):

**БЕСПЛАТНЫЕ РУБРИКИ:**
**детям** (продается и куплю);
**сдам, утеряно, даром, стол находок, ищу работу.**

## Заканчваецца падпіска на "ГАЗЕТУ ДЛЯ ВАС" на IV квартал 2009 г.

*Падпісацца на яе можна ў любым паштовым аддзяленні Івацэвіцкага раёна*

**ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ**
**(індэкс 63834)**

| | |
|---|---|
| на 1 месяц | — 4840 рублёў, |
| на квартал | — 14520 рублёў, |
| на паўгоддзе | — 29040 рублёў; |

**ДЛЯ ВЕДАМАСНАЙ ПАДПІСКІ**
**(індэкс 64145)**

| | |
|---|---|
| на 1 месяц | — 8715 рублёў, |
| на квартал | — 26145 рублёў, |
| на паўгоддзе | — 52290 рублёў; |

Роллеты.
Свид. № 0117375 от 13.02.07. г. Березовским РИК.
УНН 290730074
Гаражные ворота.
- секционные
- поворотно-подъемные
(р-ры стандартные)
Балконы раздвижные AL.
Тел. 8-(01643) 58-4-66,
8-029-723-48-04
Производство, монтаж, гарантия.

Магазин "Все для окон"
Карнизы, жалюзи, рулонные
шторы, плиссе, москитные
сетки, роллеты защитные,
римские шторы в наличии и под заказ
Наш адрес: г. Ивацевичи,
ул. Советская,9 торговый дом "Лидер"
лицензия №12340/0551537 выдана 27.08.09
т. 8(029) 2037613, 1139714

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР ЛІДЗІЯ ВАСІЛЬЕЎНА ЦАЛУЙКА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВАС
Набіраецца ў Івацэвічах, друкуецца ў філіяле №1 ААТ "Чырвоная зорка" (225409, г. Баранавічы, вул. Савецкая, 80). ЛП № 02330/0494160 ад 30.04.2004 г. Аб'ём — 4 друк. аркушы. Падпісана да друку 24 верасня ў 14.00. Заказ 2890.

"Газета для вас" выдаецца са студзеня 1997 г. Заснавальнік: УП "Газета для вас". Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі РБ. Пасведчанне № 423 ад 22 мая 2009 г.

Рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за дакладнасць фактаў. Іх меркаванні могуць не супадаць з пунктам гледжання рэдакцыі.
Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных аб'яў.
(R) — матэрыял друкуецца на правах рэкламы.
Спасылка на нашу газету абавязковая.

Падпісныя індэксы:
63834 (індывідуальная)
64145 (ведамасная)
Кошт:
у індывідуальных гандляроў — свабодны.
Тыраж 3.000 экз.

АДРАС РЭДАКЦЫІ "Газеты для вас":
вул. Леніна, 8А, г. Івацэвічы, 225295
Тэлефоны: (8-01645) 2-12-29 (гал. рэдактар),
(8-01645) 2-48-87 (факс, карэспандэнты, рэклама),
Карпункт у Бярозе — 8-029-332-94-57.
E-mail:gdv@promedia.by
http://www.gdv.of.by